*ражба*; існаванне павер'яў пра нячыстую сілу; шлюбныя забавы моладзі і рытуальныя бясчынствы; травестацыйныя працэсіі з традыцыйнай атрыбутыкай і сімволікай; асноўныя язычніцкія ігрышчы маглі мець двухтыднёвы перыяд; пакланенне зямному і нябеснаму агню; абрады з вадой; культы дрэва і расліны, жывёл і птушак; падарункі і частаванні. Гл. таксама арт. *Навагодні цыкл свят, абрадаў, звычаяў.*

*Літ.*: Агапкина Т.А. Мифопоэтические основы славянского народного календаря: Весенне-летний цикл. М., 2002; Веснавыя песні. Мн., 1979; Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі. Мн., 1990; Климишин И.А. Календарь и хронология. М., 1990; Лозка А. Беларускі народны каляндар. Мн., 2002; Яго ж. Беларускі каляндар у славянскім і еўрапейскім свеце. Мн., 2002; Яго ж. Феномен каляндарных стыляў беларускага фальклору // Праблемы ўсходнеславянскай этналінгвістыкі: Матэрыялы Перш. Міжнар. навук. канф. Мн., 2003; Яго ж. Беларускі задыякальны каляндар // Мастацтва. 2004. №1; Яго ж. Феномен Новага года ў беларускім фальклоры. Мн., 2004; Паэзія беларускага земляробчага календара. Мн., 1992.

*А. Ю. Лозка.*

**НОЖ**. Лічыўся своеасаблівым абярэгам і памочнікам у барацьбе з нячыстай сілай. Сяляне выкарыстоўвалі Н. для аховы нехрышчонага дзіцяці. Маці, сыходзячы з хаты, заўсёды пакідала Н. у калысцы, каб нячыстая сіла не падмяніла дзіця і не нашкодзіла яму. Калі нябожчыка неслі па вуліцы, а дзіця спала, у калыску клалі Н., каб смерць не зачапіла яго. Кум і кума, ідучы ў царкву хрысціць дзіця, павінны былі пераступіць цераз Н. на парозе, «каб да яшчэ нехрышчонага дзіцяці па дарозе не дачапілася нячыстая сіла». Маці, якая карміла дзіця грудзьмі, абавязкова падкладвала пад сябе Н. Як абярэг, у дзяжу, з якой даставалі рошчыну для вясельнага каравая, імгненна ўтыкалі Н., аб чым спявалася ў «каравайных» песнях: «Чатыры Н. ў дзяжы, пятая — мая сіла, каравай замясіла». Паўсюдна быў вядомы абрад лячэння сурочанай каровы: трэба ліць малако хворай жывёліны праз Н. Калі карова адбівалася ад статка і гублялася, гаспадыня брала Н. і тройчы абводзіла ім па перыметры дзвярэй хаты. Лічылася, што такімі магічнымі дзеяннямі яна «замыкала» сваю карміліцу і перасцерагала ад драпежных звяроў. Знахары, якія збіралі лекавыя расліны, мелі спецыяльныя Н., якія выкарыстоўвалі толькі для гэтай справы. З Н. звязана шэраг умоў і патрабаванняў. Кухонны Н., звычайна, добра навостраны, ніколі не клаўся на стол, за якім снедала або вячэрала сям'я. Лічылася, што Н. кепска ўздзейнічае на стан здароўя таго чалавека, на якога ён накіраваны вастрыём. Верылі, што нельга гуляць з Н. — у той жа дзень у хаце здарыцца сварка. Хто будзе есці з Н., будзе злосным і нястрыманым у выказваннях. Нельга пакідаць Н. уваткнутым у хлеб. Знойдзены Н. нельга падымаць і прыносіць дадому — ён прынясе ў хату няшчасце. Катэгарычна забаранялася дарыць Н., асабліва на Вяселле ці Улазіны. Калі дзяўчына да Вяселля дарыла свайму жаніху Н. (напрыклад, складны), такое Вяселле не ладзілася — з жаніхом здараўся няшчасны выпадак. За сталом паміж жаніхом і нявестай ці сямейнай парай не павінен ляжаць Н. Зламаны Н. — дрэнны знак. Н. ніколі не пакідалі на ноч на стале (асабліва тыя, хто мае кантакт з крывёю жывёлы), каб нячыстая сіла не магла яго скарыстаць. Забаранялася браць у рукі нож 11 верасня — дзень пазбаўлення галавы Іаана Прадцечы.

*А. В. Катовіч.*

**НОЧ**. У фалькл. спадчыне беларусаў мае рознабаковае асэнсаванне. Абмежаваная з двух бакоў самымі сакральнымі момантамі — світаннем і змяркannем – Н. набыла рысы маргінальнай прасторы, амбівалентнасці ў сваім абрадавым змесце. З аднаго боку, гэта перыяд прыроднага заміранн, сну, калі актывізуецца нячыстая сіла, з другога — час мроі, спадзяванняў, абнаўлення і зачацця. Сумяшчэнне двух процілеглых пачаткаў паўплывала на той сегмент светапоглядных уяўленняў, які быў звязаны з абрадавай практыкай. Найбольш значнай ступенню працістаяння вылучаюцца Н. вялікіх свят, сярод якіх калядныя (Першая, Другая і Трэцяя Куцця), велікодная, купальская, Н. са святой серады на Чысты чацвер. Надзвычай высокі культурны статус нададзены каляднай Н., якая супадала з Н. перад Раством Хрыстовым. Лічылася, што ў прамежак часу з 2 да 5 гадзін, калі расчыняюцца нябёсы, можна прасіць Творцу аб пазбаўленні ад самых цяжкіх хвароб і спраўджванні самых патаемных жаданняў. У першую калядную Н., да ўзыходу сонца, плялі «пута» і перавязвалі ім ножкі

стала, каб коні не разбягаліся па Н. У трэцюю калядную Н. (з 18 на 19 студзеня) адбывалася цуда: вада асвячалася нябёсамі і набывала гаючыя здольнасці. На досвітку людзі купаліся ў палонках, бралі хрышчэнскую ваду з сабой, каб забяспечыць сваю сям'ю на год гэтым моцным абярэгам. Н. з серады на Чысты чацвер была асабліва адзначана ў структуры прыроднага календара. На адкрытым месцы ставілі для касмічнага асвячэння ваду і соль, якія павінны былі ўвабраць у сябе жыццядайную, ахоўную энергію Неба і стаць на ўвесь год адным з самых моцных абярэгаў. Найбольш выразным было процістаянне добрых і злых сіл у купальскую ноч, якая знаменавала найвышэйшы росквіт сонца і адначасова яго паварот да сваёй смерці, што пабуджала нячыстую сілу ладзіць шабаш на Лысай гары. Ведзьмы стараліся забраць малако ў кароў, таму гаспадары вешалі на варотах хлява крапіву-жычку або серп, перавернуты вастрыём уніз. Усё вясковае насельніцтва збіралася вакол купальскага вогнішча, прычым утвараліся тры вялікія канцэнтрычныя колы-абярэгі. Бліжэй да вогнішча знаходзіліся дзеці і моладзь перадшлюбнага ўзросту – самыя неспрактыкаваныя, нявопытныя і безабаронныя перад сіламі цемры. Другое кола ўтваралі іх бацькі – прадстаўнікі сярэдняга пакалення. Далей ад вогнішча і адначасова на мяжы паміж святлом і цемрай размяшчаліся старыя людзі, якія ўжо спасціглі тайны Сусвету, валодалі сакрэтамі абароны свайго роду ад ліхой сілы і лічыліся захавальнікамі вясковай абшчыны. Асобныя рытуальныя дзеянні прадуцыравальнага характару выконвалі і ў некаторыя інш. Н. Так, у Н. на 21 верасня (перад 2-й Прачыстай) яшчэ да ўзыходу сонца гаспадыня брала качаргу, бегла з ёю ў агарод і стукала кожны качан капусты – каб ён быў цвёрды, як жалеза, з якога зроблена качарга. Няпростымі лічылі Н. на Дзяды (на Масленіцу, Стрэчаньскія, Сёмушныя або Траецкія, Восеньскія, Дзмітраўскія, Міхайлаўскія), якія святкаваліся ў суботу (Бацькоўскія суботы). У пятніцу ўвечары сям'я збіралася разам на памінальную вячэру, пасля якой стол не прыбіралі, спадзяючыся, што духі продкаў хаця б на некаторы час завітаюць у родную хату і тым самым асвецяць будучае жыццё сваіх прадаўжальнікаў. У структуры Н. вылучалі часткі, кожная з якіх надзялялася характэрнымі рысамі і займала адпаведнае месца ў сістэме традыцыйнага злічэння часу. Перыяд сутак ад заходу сонца да поўначы быў напоўнены рознымі абрадавымі дзеяннямі і забаронамі. Усход першай зоркі лічыўся пачаткам першай каляднай вячэры. У гэты ж час праводзіліся жалобныя сталы, адзначаліся Восеньскія Дзяды. Пасля заходу сонца нельга было пераносіць з адной вёскі ў другую вырабы, складзеныя з дробных частак (напрыклад, саламяную карзіну, рэшата, кош); чапаць курыцу, пасаджаную на яйкі, інакш каршун падушыць усіх куранят; выносіць смецце з хаты, каб не асляплі куры; прыбіраць ў хаце (падмятаць падлогу), каб не вымесці шчасце і ўдачу. З надыходам Н. лічылася непажаданым браць ваду з калодзежа, распачынаць новы бохан хлеба, пазычаць агонь, выносіць дзяцей у двор, хадзіць у лазню, купацца ў вадаёмах, мыць і вывешваць на вуліцу бялізну, адпраўляцца ў падарожжа. Нельга было памінаць нячысцікаў. Самым небяспечным лічыўся час самой поўначы, асабліва да трох гадзін ночы – час найбольш актыўных паводзін нячыстай сілы. Аднак пасля таго, як трэці раз праспяваюць пеўні, нячысцікі страчвалі сваю сілу і збягалі.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 1. Зямля стаіць пасярод свету... Мн., 1999. С.125, 327, 421; К р у к Я. Сімволіка беларускай народнай культуры. Мн., 2001; С т е п а н о в а Н.И. Большая книга магии. М., 2001. Кн. 2. С. 22—33; К р у к Я., К о т о в и ч О. Колесо времени: традиции и современность. Мн., 2003. С. 126—131.

*А. В. Катовіч.*

«**НУМАРЫ́**», народная гульня. Адносіцца да ліку шлюбных моладзевых забаў. Запісана ў 1992 у в. Славені Шклоўскага раёна. Звычайна праводзіцца на вячорках (ігрышчах). Удзельнічалі хлопцы і дзяўчаты, якія тайна выбіралі сабе парадкавыя нумары: першыя — цотныя, другія — няцотныя (маглі быць і інш. ўмовы па прысваенні лікаў). Затым усе садзіліся кругам. Гульцы па чарзе выходзілі ў цэнтр, называючы лічбы са словамі: «Каму жыць, каму жыць, каму нажывацца. Сяду на калені, буду цалавацца». Той, каму пашчасціла адгадаць «нумар», атрымліваў магчымасць пацалавацца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ